***М. С. Шчалкун***
*Навук. кір.* ***Т. А. Фіцнер,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## ВЫЯЎЛЕННЕ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ Ў ПАЭЗІІ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ

Ларыса Геніюш – яркі прадстаўнік айчыннага пісьменства першай паловы XX ст. Аўтарка заўсёды выступала як вялікая пакутніца і заступніца Беларусі, сваёй Радзімы. Бацькаўшчына для яе, насамрэч, галоўны сэнс быцця, надзеі і пакуты, радасць і слёзы. Традыцыі Бацькаўшчыны для паэткі былі нечым родным і каштоўным, хаця яна знаходзілася далёка за межамі сваёй краіны. Гэта адлюстравалася ў зборніках – «Ад родных ніў», «Невадам з Нёмана», «На чабары настоена». Адарваная ад сваёй Радзімы, Л. Геніюш з першых старонак зборніка «Ад родных ніў» выказвае трывогу, смутак і сваё жаданне жыць у Беларусі. У зборніку «Невадам з Нёмана» яна звяртаецца да сваёй біяграфіі і апісвае родных людзей. Верш «Гудзевічы» напоўнены пяшчотнымі момантамі з дзяцінства паэткі. Усю прыгажосць свайго краю яна паказвае праз апісанне прыроды: «*Цвіў той бэз, як цуд, на ўсіх дарогах, апіраўся на амшэлы брук, воблакам суквеццяў ля парогаў, нахіляўся да дзіцячых рук*» [1]. Лёгка зразумець, каму прысвечаны гэты верш: «*Гудзевічы, род мой незабыты, беларуская мая сям'я. Дождж змывае з надмагільнай пліты дарагое дзедава імя*» [1]. Паказальным з'яўляецца верш «Крывёй напоўніліся поймы рэк», напісаны ў цяжкі перыяд жыцця паэткі. На яе думку, чалавек у любых умовах павінен памятаць Бацькаўшчыну, бо пакуль душа жыве, то і родны край будзе жыць: «*На вуснах песня, мой апошні дых, цяплом з-пад сэрца словы саграваю, жывая я яшчэ сярод жывых, у душы маёй і Беларусь жывая!*» [1]. Зборнік "Невадам з Нёмана" найлепш раскрывае талент Л. Геніюш, бо ў ім сабрана ўсё блізкае і каштоўнае для яе: звязанае з родным краем, з Беларуссю, з яе мінулым, супярэчлівай сучаснасцю і лепшым будучым. Вершы з трэцяга зборніка паэзіі Л. Геніюш вызначаюцца лірызмам і пяшчотай. Паэтка зноў звяртаецца да родных краявідаў, да тэмы пакаленняў у вершах «Мая крыніца»: «*То дзяцінства майго залатая крыніца // вабіць жоралам вечна жывое красы*» [1].

Аналіз вершаў Л. Геніюш дазваляе зрабіць выснову, што любоў да Радзімы немагчыма без любові да роднай мовы, да родных мясцін, без любові і гонару за продкаў.

### Літаратура

1 Геніюш, Л. Родныя вобразы / Л. Геніюш [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://rv-blr.com/verse/show/all/ . – Дата доступу : 26.04.2019

***А. А. Шчарбатая***
*Навук. кір.* ***В. С. Новак,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННЫЯ АБРАДЫ І ЗВЫЧАІ АКЦЯБРСКАГА РАЁНА: МЯСЦОВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

Адной з самых цікавых і шматгранных з'яў беларускага фальклору з'яўляецца радзінна-хрэсьбінная абраднасць, якая ўвасобіла своеасаблівую народную філасофію, звязаную з нараджэннем немаўляці. Навуковую каштоўнасць уяўляюць фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы па радзінна-хрэсьбіннай абраднасці, запісаныя ў палявых экспедыцыях на тэрыторыі Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці.

Важнае месца ў сістэме гэтага абрадавага комплексу займаюць прыкметы і павер'і, якія дэманструюць багацце народных вераванняў, звязаных з цяжарнасцю жанчыны, якая прытрымлівалася пэўных прадпісанняў і забарон.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ